БЕЛАРУСКАЯ КАТАЛІЦКАЯ УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА
СЬВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА Ў ЛЁНДАНЕ

# ДАБРАВЕШЧАНЬНЕ




ЛЁНДАН 1993

## 24 сакавіка

# ПЕРАДСЬВЯЦЬЦЕ ДАБРАВЕШЧАНЬНЯ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** *песьні Трыядзі, пасьля наступныя:*

(*Тон 4*). Арханёл Габрыель пацьвярджае тайну, няведамую і скрытую ад анёлаў; ён прыходзіць да Цябе, чыстая і добрая Галубка, выбраная з роду людзкога, і кліча : "Радуйся, Усесьвятая, рыхтуйся прыняць словам маім Бога-Слова ва ўлоньне Тваё".

Азораны хорам — чыстае ўлоньне Слугі Тваёй, — падрыхтавана Табе, Госпадзе. Дык зыйдзі і пасяліся ў ім; у дабраце і спагадлівасьці да твораў Тваіх збаў нас ад няволі сьмерці і аднаві нашу першасную красу. Тваім прыйсьцем дай нам ‹ пакой і збаўленьне.

Арханёл Габрыель прыходзіць да Цябе, Усячыстая, і к ліча: "Радуйся, Вызваленьне ад праклёну; радуйся, Устаньне тых, што ўпалі; радуйся, адзіная Выбраньніца Бога; радуйся, Калясьніца Сонца славы! Прымай Бесьцялеснага, які захацеў пасяліцца ва ўлоньні Тваім.

Слава ... цяпер...

((*Тон 2*). Сёньня Габрыель прыносіць добрую вестку Поўнай ласкі, кажучы: "Радуйся, Дзева Маці, што ня ведала мужа! Не дзівіся майму незвычайнаму выгляду і ня бойся, бо я арханёл. Некалі зьмяя ашукала Эву, сёньня ж я прыношу Табе радасную вестку, што Ты, Усячыстая, не зазнаеш тленнасьці і народзіш Госпада".

*Далей парадак вялікапоснай вячэрні, або (у сераду і пятніцу) Літургіі раней асьвячаных Дароў.*

### ЛІТУРГІЯ (калі ёсьць)

*Трапар (тон 4).* Сёньня пачатак сусьветнай радасьці заахвочвае нас запяяць перадсьвяточную песьню; Габрыель прыходзіць да Дзевы з добрай весткаю, ускліκаючы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

*Кандак (тон 8).* Ты, Багародзіца — пачатак збаўленьня для ўсіх нас. Слуга Божы, вялікі начальнік анёлаў Габрыель, быў пасланы да Цябе, каб абвясьціць вялікую радасьць. Дзеля гэтага і мы клічам: "Радуйся, Дзева Маці!"

## 25 Сакавіка

# ДАБРАВЕШЧАНЬНЕ НАЙСЬВЯЦЕЙШАЕ БАГАРОДЗІЦЫ

### ВЯЧЭРНЯ
**(24 сакавіка вечарам)**

*У нядзелю, панядзелак, аўторак і чацьвер вечарам увесь парадак вячэрні, як ніжэй. У сераду і пятніцу пасьля чытаньняў бывае Літургія Раней Асьвячаных Дароў.*

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":** *тры наступныя песьні з паўтарэньнем:*

(*Тон 6*). Спрадвечны плян Божы абвясьціў Табе, Сьвятая Дзева, Габрыель. Стаўшы перад Табою, ён прывітаў Цябе, кажучы: "Радуйся, Зямля незасеяная; радуйся, незгаральны Кусьце; радуйся, Глыбіня недасяжная; радуйся, Мост, што вядзе да неба, і Лесьвіца высокая, якую бачыў Якуб; радуйся, боскі Посудзе манны; радуйся, ад праклёну Звальненьне; радуйся, Вызваленьне Адамава. Госпад з Табою".

"Ты зьявіўся мне ў выглядзе чалавека, — кажа арханёлу Чыстая Дзева,—дык як жа ты Мне гаворыш рэчы, вышэйшыя за розум людзкі? Ты ж кажаш, што Госпад са мною і што Ён паселіцца ва ўлоньні маім. Скажы мне, як гэта я стануся такім прасторным паселішчам і месцам сьвятасьці, вышэйшым за хэрувімаў? Не спакушай мяне хітрасьцямі, бо мне любасьць чужая, і ня знаю сужэнскага жыцьця: як жа тады я нараджу дзіця?"

"Калі Бог хоча, законы прыроды адмяняюцца — кажа Ёй арханёл, — і адбываюцца рэчы звышчалавечыя. Дык вер словам маім, Усячыстая і Бязьвінная, бо яны праўдзівыя". Яна ж тады адказала: "Хай станецца мне згодна са словам тваім. Нараджу Бесьцялеснага, які возьме цела ад мяне, каб, будучы ўсемагутным, зьяднацца з чалавекам і вярнуць яго да ранейшай годнасьці".

Слава ... цяпер.....

(*Тон 6*). Арханёл Габрыель быў пасланы з неба абвясьціць Дзеве радасную вестку Ейнага зачацьця. Прыйшоўшы ў Назарэт, ён падумаў у сабе, дзівячыся цуду: "Як гэта здарылася, што Той, каго нябёсы зьмясьціць ня могуць, родзіцца ад Дзевы;Той, хто мае за пасад неба і зямлю за падножак для ног сваіх, у дзявочым улоньні зьмяшчаецца; Той, на якога шасьцікрылыя сэрафімы і шматвокія хэрувімы зірнуць ня сьмеюць, словам адным ад Дзевы цела прыняць захацеў, сам будучы Божым Словам? Дык чаго ж я стаю і не кажу Дзеве: «Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою; радуйся,

Чыстая Дзева, Нявеста беззаганная; Радуйся, Маці Жыцьця! Блаславёны плод улоньня Твайго".

**Чытаньне кнігі Быцьця** (*28:10-17*)

Якуб выйшаў з Баршэбы і пайшоў у Харан. Дайшоў ён да аднаго месца і астаўся там начаваць, бо ўжо сонца зайшло. Ён узяў камень і паклаў сабе пад галаву, кладучыся спаць на гэтым месцы. І прысьнілася яму лесьвіца, якая стаяла на зямлі і верхам сваім даставала да неба. І бачыў ён анёлаў, якія ўзыходзілі ўгору і зыходзілі ўніз; бачыў таксама Госпада, які стаяў на вышыні і казаў: "Я — Госпад, Бог Абрагама і Бог Ісаака. Зямлю, на якой ляжыш, аддаю табе і тваім нашчадкам. А нашчадкі твае будуць так шматлікія, як пыл зямны. І распаўсюдзішся ты на захад і ўсход, на поўнач і поўдзень; і ўсе плямёны зямныя атрымаюць блаславеньне праз цябе і нашчадкаў тваіх. Я буду заўжды з табою, куды ні пойдзеш, а потым прывяду цябе да гэтай зямлі. І не пакіну цябе, пакуль ня споўню ўсяго, што абяцаў". Пачуўшы гэта, Якуб падумаў: "Сапраўды Госпад ёсьць на гэтым месцы, а я ня ведаў". І, устрывожаны, сказаў: "Якое страшнае гэтае месца! Сапраўды гэта дом Божы і брама да неба!"

**Чытаньне кнігі прарока Езакіеля** (*43:27-44:4*)

Так кажа Госпад: "Пасьля гэтых дзён, восьмага дня і пазьней сьвятары вашы павінны прыносіць ахвяры цэлапаленьняў і вашы мірныя ахвяры, і Я буду спагадлівы да іх". Тады завёў мяне да вонкавай брамы сьвятыні, зьвернутай на ўсход, але яна была зачыненая. І сказаў мне Госпад: "Нельга яе адчыняць, і ніхто не павінен уваходзіць праз яе, бо праз яе ўвайшоў Госпад, Бог Ізраіля. Дзеля гэтага яна павінна быць зачыненая. Толькі цар можа сесьці ў ёй для застольля. Але ўваходзіць ён павінен праз сені, што ля брамы, і той самай дарогаю выходзіць". Пасьля павёў мяне паўночнаю брамаю да сьвятыні. Я глянуў, і вось слава Гасподняя напоўніла сьвятыню Гасподнюю.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*9:1-11*)

Мудрасьць збудавала сабе дом і вычасала сем стаўпоў да яго. Забіла свае ахвяры, зьмяшала віно сваё і прыгатавала стол. Паслала слугаў сваіх клікаць моцным голасам на пачастунак, кажучы: "Хто прастадушны, хай прыходзіць да мяне". А тым, што жадалі мудрасьці, казала: "Хадзеце, ешце мой хлеб, піце віно, якое я зьмяшала; пакіньце дурасьць — і будзеце жыць; хадзіце шляхамі разважнасьці". Хто жадае навучаць насьмешніка, накліча на галаву сваю няславу; а хто дакарае грэшніка, сам сабе шкодзіць. Не дакарай насьмешніка, бо ён цябе ўзьненавідзіць.

Папраў мудрага, і ён цябе любіць будзе. Дай мудраму раду і ён стане мудрэйшым. Навучы праведніка, і ён пабольшыць веды свае. Пачатак мудрасьці — страх Гасподні, і спазнаваньне Сьвятога — розум. Дзякуючы мне дні твае прадоўжацца, і памножыцца лік гадоў тваіх.

***Увага:*** *У сераду і пятніцу пасьля чытаньняў бывае Літургія Раней асьвячаных Дароў, а ліцьця і вершапесьні служацца на павячэрніцы.*

**Ліцьця**

*(Тон 1).* У шосты месяц пасланы быў начальнік анёлаў да Цябе, Чыстая Дзева, каб абвясьціць Табе слова збаўленьня і прывітаць Цябе, кажучы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою! Ты народзіш Сына, які нарадзіўся спрадвеку ад Айца. Ён збавіць людзей сваіх ад грахоў".

У шосты месяц пасланы быў арханёл Габрыель з неба ў галілейскі горад Назарэт да Дзевы з радаснаю весткаю. Прыйшоўшы, ён прывітаў Яе словамі: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою! Радуйся, Умяшчальніца неўмяшчальнай Існасьці, бо блаславёнае ўлоньне Тваё зьмясьціла Таго, каго неба ня можа зьмясьціць. Радуйся, блаславёная, Адамава пачэснае Абнаўленьне і Эвіна Збаўленьне, Радасьць сьвету ўсяго і Шчасьце роду людзкога!"

Арханёл Габрыель быў пасланы ад Бога з неба да найчыстай Дзевы ў горад галілейскі Назарэт, каб абвясьціць Ёй радасную вестку невыказнага Ейнага зачацьця. Пасланы быў слуга бесьцялесны да духоўнага Места і духоўнай Брамы, каб абвясьціць прыйсьце Ўладара; пасланы быў нябесны вой да адухаўлёнага слаўнага Хораму, каб прыгатаваць чыстае памяшканьне Творцу. Прыйшоўшы, кажа Ёй: "Радуйся, вогненны Пасадзе, больш слаўны за чатырохтварага! Радуйся, Паселішча нябеснага Ўладара! Радуйся, Гара непарушная! Радуйся, пачэсны Посудзе! У Табе цялесна пасялілася поўня Боства воляю спрадвечнага Айца і садзеяньнем Сьвятога Духа! Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

Слава ...

*(Тон 8).* Хай радуецца неба і цешыцца зямля, бо спрадвечны і роўны славаю з Айцом Сын, багаты чалавекалюбнай міласэрнасьцю, даў сябе спустошыць згодна з воляй і провідам Айца і пасяліўся ў дзявочым улоньні, асьвячаным Духам. Слаўны цуд! Бог зьяўляецца ў чалавечым выглядзе, Неўмяшчальны месьціцца ва ўлоньні, Спрадвечны — у часе. Яшчэ больш слаўная і вялікая тайна Ягонага бясьсеменнага зачацьця і невыказнага

спусташэньня! Бог паніжаецца, прымае цела і выгляд стварэньня, калі анёл абвяшчае чыстай Дзеве, што Яна зачне Сына, і ўсклікае: "Радуйся, Поўная ласкі, з Табою Госпад, які мае багацьце міласэрнасьці!"

Цяпер....

(*Тон 2*). Сёньня Габрыель прыносіць добрую вестку Поўнай ласкі, кажучы: "Радуйся, Дзева Маці, што ня ведала мужа! Не дзівіся майму незвычайнаму выгляду і ня бойся, бо я арханёл. Некалі зьмяя ашукала Эву, сёньня ж я прыношу Табе радасную вестку, што Ты, Усячыстая, не зазнаеш тленнасьці і народзіш Госпада".

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). У шосты месяц быў пасланы арханёл да Чыстае Дзевы, і, кажучы Ёй радавацца, абвясьціў, што ад Яе мае нарадзіцца Збавіцель. Прыняўшы прывітаньне, Яна зачала спрадвечнага Бога, які ў невыказны спосаб захацеў стацца чалавекам для збаўленьня душ нашых.

*Верш*: Абвяшчайце з дня на дзень збаўленьне Бога нашага.

Незразумелымі здаліся Багародзіцы словы арханёла, калі той аб'явіў Ёй радасную вестку. Прыняўшы прывітаньне, Яна зачала Цябе, Бога спрадвечнага. Дзеля гэтага мы радасна ўсклікаем Табе: "Божа, што прыняў цела, застаўшыся тым, чым заўжды быў, даруй сьвету Твайму супакой і душам нашым багацьце зьміласаваньня Твайго".

*Верш*. Сьпявайце Госпаду песьню новую; сьпявай Госпаду, уся зямля.

Вось Абяцаны сёньня аб'явіўся нам: вышэй за разуменьне, Бог злучаецца з родам людзкім, і голас арханёла спакусу адганяе. Дзева прымае радасьць, зямное стаецца небесным, і сьвет вызваляецца ад першаснага праклёну. Хай цешыцца ўсё стварэньне і хай пяе моцным голасам: "Творча і Збавіцелю наш, слава Табе!"

Слава ... цяпер ....

(*Тон 4*). Сёньня радасьць Дабравешчаньня, сьвята дзявоцтва: зямное з нябесным аб'ядноўваецца, Адам абнаўляецца, Эва вызваляецца ад даўняга суму; і Носьбітка нашай існасьці, абагаўлёнай злучэньнем з Тым, хто прыняў цела ад Яе, стаецца Царквою Божаю. Што за тайна! Няведамая дасюль спагадлівасьць, невыказнае багацьце ласкі! Анёл служыць цуду, дзявочае ўлоньне

прымае Сына, Дух Сьвяты ўніз пасылаецца, Айцец на вышынях спагадае. І супольнай радаю зьмена настае. У Ёй і Ёю мы збаўляемся, з Габрыелем ускліκаем Дзеве: "Радуйся, Поўная радасьці, бо ад Цябе Збаўленьне наша, Хрыстос Бог, узяў нашу прыроду і да сябе ўзьнёс. Малі Яго за збаўленьне душ нашых".

**Адпушчальны Трапар**

*(Тон 4).* Сёньня пачатак нашага збаўленьня і спрадвечнае тайны аб'яўленьне: Сын Божы стаецца Сынам Дзевы і Габрыель ласку абвяшчае. Дзеля гэтага і мы разам з ім ускліκнем Багародзіцы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

## ЮТРАНЬ

***Трапар*:** Сёньня пачатак нашага збаўленьня... *(Тройчы)*

***Першая сядальная песьня*** *(тон 1).* Вялікі начальнік анёлаў прыйшоў у горад Назарэт і абвясьціў Табе, Усячыстая, Уладара і Госпада вякоў, кажучы: "Радуйся, благаслаўлёная Марыя, невыказны і недасяжны Цуд, Абнаўленьне людзей!"

Слава... цяпер...: *Тое самае.*

***Другая сядальная песьня*** *(тон 3).* Сёньня радуецца ўсё стварэньне, бо арханёл кажа Табе: "Радуйся, бласлаўлёная, пачэсная і ўсячыстая Маці Хрыста Бога!" Сёньня гордае зухвальства зьмяінае перможанае, і путы праайцоўскага праклёну разьвязваюцца. Дзеля гатага мы няспынна ўсклікаем Табе: "Радуйся, Поўная ласкі!"

Слава... цяпер...: *Тое самае.*

*Пасьля Паліелею ўзьвялічваньне сьвята:*

Разам з арханёлам клічам, Усячыстая: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

*Верш 1.* Божа, учыні суд уладару, і справядлівасьць Тваю сыну ўладара. *(Пс 71:1)*

*Верш 2.* Зыйдзе, як дождж на руна, як лівень, што арашае зямлю. *(Пс 71:6)*

Слава...цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа. *(Тройчы)*

*Трэцяя сядальная песьня (тон 4).* Габрыель з неба ўсклікнуў да Ўсепачэснай: "Радуйся, бо Ты зачнеш ва ўлоньні спрадвечнага Бога, які словам сусьвет стварыў". Але Марыя адказала яму: "Я ж не замужам, дык як нараджу сына? Хто калі бачыў бясьсеменнае нараджэньне?" Тады сказаў арханёл Багародзіцы і Дзеве: "Дух Сьвяты сыдзе на Цябе, і сіла Ўсявышняга ацяніць Цябе".

Слава... цяпер...

Габрыель быў пасланы да Дзевы Марыі і абвясьціў Ёй вялікую радасьць: "Зачнеш без семя і застанешся непарушнаю. Народзіш Сына — Спрадвечнага Бога, які збавіць людзей сваіх ад іхніх грахоў. Той, хто паслаў мяне сказаць Табе, Блаславёная: 'Радуйся!', сьведчыць, што, будучы Дзеваю, народзіш Сына і пасьля родаў Дзеваю застанешся".

*Узыходная песьня: першы антыфан нядзельны 4 тону.*

***Пракімен*** *(Пс 95:2,1).* Абвяшчайце з дня на дзень збаўленьне Бога нашага.

*Верш.* Сьпявайце Госпаду песьню новую: сьпявай Госпаду, уся зямля.

Усё, што жыве...

**Сьвятое Евангельле паводле Лукі** *(1:39-49,56)*

У тыя дні Марыя, устаўшы, пайшла хутка ў горныя мясьціны ў горад (пакаленьня) Юды. І ўвайшла ў дом Захара і прывітала Альжбету. Калі Альжбета пачула прывітаньне Марыі, дзіцятка ў ейным улоньні заварушылася, і напоўнілася Альжбета Духам Сьвятым. І ўсклікнула моцным голасам, кажучы: "Блаславёная Ты між жанчынаў і блаславёны Плод улоньня Твайго. І адкуль мне гэта, што прыйшла да мяне Маці Госпада майго? Бо вось як толькі голас Твайго прывітаньня загучаў у вушох маіх, дзіцятка ва ўлоньні маім заварушылася з радасьці. Блаславёная Ты, што паверыла, бо споўняцца словы, сказаныя Табе ад Госпада".

Тады сказала Марыя: Душа мая абвяшчае веліч Госпада, і мой дух узрадаваўся ў Богу Збаўцы маім. Бо Ён глянуў на пакорнасьць служкі сваёй: ад гэтага часу шчасьліваю называць мяне будуць усе пакаленьні. Бо вялікія справы ўчыніў мне Ўсемагутны. Сьвятое імя Яго".

Марыя прабыла ў яе тры месяцы і пасьля вярнулася дамоў.

*Пасьля Псалму 50:*

Слава...: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер...: *Тое самае.*

Змілуйся над намі, Божа...:

*(Тон 2).* Сёньня Габрыель прыносіць добрую вестку Поўнай ласкі, кажучы: "Радуйся, Дзева Маці, што ня ведала мужа! Не дзівіся майму незвычайнаму выгляду і ня бойся, бо я арханёл. Некалі зьмяя ашукала Эву, сёньня ж я прыношу Табе радасную вестку, што Ты, Усячыстая, не зазнаеш тленнасьці і народзіш Госпада".

## КАНОН
(*тон 4*)

***Увага.*** *Ірмасы паўтараюцца як катавасіі ў канцы песьняў. Усе песьні, апрача дзевятай, сьпяваюцца з прыпевамі, як першая.*

***Песьня 1.*** *Ірмас.* Адчыню вусны мае, і напоўняцца Духам; і слова скажу ў гонар Уладаркі Маці, спраўляючы сьветлую ўрачыстасьць і славячы радасна ў песьнях цуды Яе.

*Прыпеў*: Усесьвятая Багародзіца, збаў нас.

Хай праайцец Давід , граючы на духоўных гусьлях, пяе Табе, Уладарка: "Слухай, дачка, радаснага голасу анёла, бо ён абвяшчае Табе невыказную радасьць".

*Прыпеў*: Усесьвятая Багародзіца, збаў нас.

Анёл: "Радасна кажу Табе: прыхілі вуха Тваё і слухай, што я кажу Табе аб Божым зачацьці. Бо вось Ты, Усячыстая, знайшла ў Госпада ласку, якой не зазнала ніякая іншая жанчына".

Слава...

Багародзіца: "Дай Мне зразумець сэнс словаў тваіх: як гэта станецца тое, што ты кажаш? Скажы мне ясна, як гэта Я, будучы дзеваю, зачну, і як буду Маці Творцы майго?"

Цяпер...

Анёл: "Ты думаеш, што хачу Цябе падмануць. Цешуся з Тваёй абачлівасьці. Але ня бойся, Уладарка, бо калі Бог хоча, дзеюцца дзівосныя і слаўныя рэчы "

***Катавасія.*** *Адчыню вусны мае...*

*Песьня 3. Ірмас.* У боскай славе Тваёй, Багародзіца, жывая і невычэрпная Крыніца, умацуй аднадушны хор песьняроў Тваіх і зрабі іх дастойнымі вянцоў славы.

Багародзіца: "Няма больш князя з пакаленьня Юды, але блізка ўжо час, калі зьявіцца Хрыстос, надзея ўсіх людзей. Ты ж Мне скажы, як Я нараджу Яго, будучы дзеваю?"

Анёл: "Ты, Дзева, хочаш ведаць спосаб Твайго зачацьця. Але ён невыказны: Дух Сьвяты ўчыніць гэта, ахінуўшы Цябе жыцьцядайнай сілаю сваёю".

Багародзіца: "Прамаці мая паслухала намовы зьмяі і была выгнаная з раю; таму і я баюся ўпасьці і з асьцярогаю ўспрыймаю словы твае".

Анёл: "Бог паслаў мяне аб'явіць Табе Божую волю. Дык чаму, Усебеззаганная, Ты ўстрывожылася ад словаў маіх? Гэта мне трэба быць у страху перад Табою. Чаму стаіш пакорна, калі я аддаю пашану Табе?"

***Сядальная песьня** (тон 8).* "Слова Божае на зямлю сёньня зышло, — Анёл, стаўшы, усклікнуў Дзеве. — Радуйся, Блаславёная, бо Ты, адзіная сярод жанчынаў, захаваўшы пячаць дзявоцтва, прыняла ва ўлоньне сваё спрадвечнае Слова і Госпада, які як Бог прыходзіць збавіць ад маны род людзкі".

*Песьня 4. Ірмас.* Хрыстос, Бог спрадвечны, што сядзіць у славе на Боскім пасадзе, прыходзіць на хуткай хмары і нятленнай рукою збаўляе тых, што клічуць: "Слава, Хрысьце, сіле Тваёй".

Багародзіца: "Я чула, што некалі прарок прадказаў прыйсьце Эмануэля, і што сьвятая Дзева мае нарадзіць дзіця. Але хачу зразумець, як гэта людзкая прырода дазнае злучэньня з Боствам".

Анёл: "Ахоплены агнём куст, што не згараў, быў правобразам тайны, што мае зьдзейсьніцца ў Табе , Чыстая Дзева, поўная ласкі. Бо пасьля нараджэньня Ты застанешся Дзеваю".

Багародзіца: "Габрыелю, вестуне праўды, што зьзяеш у сьветласьці Ўсемагутнага Бога, скажы мне: як гэта Я, застаўшыся чыстай дзеваю, нараджу ў целе бесьцялеснае Слова?"

Анёл: "Стаю перад Табою ў страху, як слуга перад гаспадыняю, і баюся глянуць на Цябе, Дзева. Быццам дождж на руна, зыдзе на Цябе Слова Айца, бо такая добрая воля Яго".

*Песьня 5. Ірмас.* Усё стварэньне сумелася, убачыўшы боскую славу Тваю: Ты, Дзева, што мужа ня знала, мела ва ўлоньні Бога ўсіх, і нарадзіла спрадвечнага Сына, які дае супакой усім, што славяць Цябе.

Багародзіца: "Не магу зразумець сэнсу словаў тваіх. Розныя цуды, знакі і вобразы законныя былі зьдзейсьненыя ў мінулым сілаю Божаю. Але ніколі не было, каб Дзева, што ня знала мужа, нарадзіла дзіця".

Анёл: "Ты дзівішся, беззаганная Дзева; і сапраўды вялікі цуд тое, што адбываецца з Табою, бо Ты адзіная зачнеш ва ўлоньні Ўладара ўсіх, які возьме цела ад Цябе. Гэта Цябе прадказвалі прарокі і знакі законныя".

Багародзіца: "Як можа Той, каго ніщто ня можа ўмясьціць і на каго ніхто ня сьмее глянуць, пасяліцца ва ўлоньні Дзевы, якую сам стварыў? І як зачну Я Бога-Слова, што разам з Айцом і Духам ня мае пачатку?"

Анёл: "Той, хто абяцаў праайцу Давіду пасадзіць ад семя ягонага на пасадзе свайго валадарства, выбраў Цябе, Хвала Якуба, за духоўнае жыльлё сабе".

*Песьня 6. Ірмас.* Як вобраз Твайго трохдзённага пахаваньня, Ёна ўсклікнуў у чэраве кіта: "Вызваль мяне ад тленнасьці, Ісусе, Уладару і Госпадзе сіл".

Багародзіца: "Атрымаўшы Добрую вестку, Я, Габрыелю, поўная боскай радасьці. Бо ты ж гаворыш мне аб радасьці, і абвяшчаеш вясельле, якому няма канца".

Анёл: "Табе, Божая Маці, даецца радасьць; Табе, Божая Нявеста, усё стварэньне пяе «Радуйся!», бо Ты, Усячыстая, адзіная была прызначаная стацца Маці Сына Божага".

Багародзіца: "Хай першаснае асуджэньне будзе адмененае праз мяне ; хай сёньня праз мяне доўг будзе сплачаны; хай праз мяне старая належнасьць будзе поўнасьцю аддадзеная".

Анёл: "Бог абяцаў Абрагаму, што ў семені ягоным усе народы атрымаюць блаславеньне. Сёньня ў Табе, Чыстая, абяцаньне спаўняецца".

*Кандак (тон 8).* Магутная Ўладарка Багародзіца, мы, верныя слугі Твае, выбаўленыя Табою ад бедаў, песьні ўдзячнасьці і перамогі Табе прыносім. Ты ж, маючы сілу непераможную, ад

усякіх напасьцяў выратуй нас, каб нам усклікнуць: "Радуйся, Дзева Маці"!

*Ікас.* Начальнік анёлаў быў пасланы з неба сказаць Багародзіцы "Радуйся". І, калі яшчэ ня сьціхла гучаньне ягоных бесьцялесных словаў, Ты, Госпадзе, прыняў цела ад Яе. Убачыўшы гэта, анёл сумеўся і ўсклікнуў:

Радуйся, бо дзякуючы Табе радасьць зазьзяе!
Радуйся, бо праз Цябе згіне праклён!
Радуйся, Пакліканьне паўшага Адама!
Радуйся, Вызваленьне Эвы ад сьлёзаў!
Радуйся, недасяжная Вышыня думак людзкіх!
Радуйся, Глыбіня непранікальная нават для анёлаў!
Радуйся, Пасад Уладара!
Радуйся, што носіш Таго, хто носіць усё!
Радуйся, Зорка, праз якую сонца зазьзяла!
Радуйся, Улоньне Божага ўцелаўленьня!
Радуйся, бо праз Цябе абнаўляецца ўсё стварэньне!
Радуйся, бо праз Цябе пакланяемся Творцу!
Радуйся, Дзева Маці!

***Песьня 7.*** *Ікас.* Мужныя і багамудрыя юнакі, не захацеўшы служыць стварэньню замест Творца, вогненнае выпрабаваньне за нішто палічыўшы, радасна сьпявалі: "Усяхвальны Госпад і Бог айцоў, блаславёны Ты".

Багародзіца: "Ты прыносіш мне добрую вестку Божай радасьці, што Духоўнае Сьвятло ў сваёй бязьмежнай міласэрнасьці зьяднаецца з рэчыўным целам, і ты клічаш: "Блаславёны плод улоньня Твайго, Усячыстая".

Анёл: "Радуйся, Уладарка Дзева; радуйся, Скарбніца Божая; радуйся, Падсьвечнік Сьвятла, Адамава Пакліканьне, Эвіна Вызваленьне, Гара сьвятая, сьветлая Сьвятыня, Хорам несьмяротнасьці!"

Багародзіца: "Зыход Духа Сьвятога ачысьціў душу, цела асьвяціў, учыніў мяне сьвятыняю, што ўмяшчае Бога; ківотам, упрыгожаным Богам; адухоўленым хорамам і чыстай Маці Жыцьця".

Анёл: "Бачу Цябе, як падсьвечнік шматсьвечны, Богам створаны хорам і як залаты ківот. Прымі сёньня, Боганявеста, Таго, хто даў Закон, і з добрай волі сваёй захацеў праз Цябе збавіць зьнямоглую людзкую прыроду".

***Песьня 8.*** *Ірмас.* Слухай, чыстая Дзева, хай Габрыель абвесьціць Табе загад Божы стары і праўдзівы. Будзь гатовая прыняць Бога,

бо праз Цябе Неўмяшчальны з людзьмі зажыве. Дзеля гэтага радасна клічу: "Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

"Розум людзкі ня можа — адказвае Дзева, — зразумець дзіўныя рэчы, якія мне кажаш. Чую твае словы, і поўнюся трывогаю, каб мне не папасьці ў падман, як некалі Эва, і ня быць адлучанай ад Бога. Але чую, як клічаш: Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

"Вось Табе разьвязка цяжкасьцяў, —кажа Габрыель. — Добра кажаш, што абвяшчаю рэчы цяжкія для разуменьня. Дык слухайся ўласных словаў сваіх, вер і не ўсумніся. Я ж радасна клічу: Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

"Нараджэньне — гэта вынік узаемнай любові, — Беззаганная кажа зноў. — Такі закон Божы для людзей. Я ж не зазнала радасьці сямейнага жыцьця, дык як ты кажаш, што нараджу дзіця. Баюся, што мяне ўводзіш у падман. Але чую , як клічаш: "Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

"Тое, што Ты, Усячыстая, кажаш, — анёл адказвае Ёй, — датычыць сьмяротных людзей; але я Табе кажу пра нараджэньне Бога. Вышэй за ўсякае разуменьне, у спосаб, Яму аднаму ведамы , Ён прыме цела ад Цябе. Дзеля гэтага клічу радасна: Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

"Ты здаешся мне праўдамоўным вестуном, —кажа Дзева, — бо ты дабравесьціш радасьць для ўсіх. Душа і цела мае чыстыя, дык хай станецца мне згодна са словам тваім; хай паселіцца ўва мне Бог, якому разам з табою пяю: Блаславіце, усе творы Гасподнія, Госпада".

*"Больш годную пашаны..." не сьпяваецца. Наступны сьвяточны прыпеў сьпяваецца перад ірмасам і ўсімі строфамі дзевятай песьні:*

Абвяшчай, зямля, радасьць вялікую; хваліце, нябёсы, славу Божую.

***Песьня 9.*** *Ірмас.* Хай ніякая нячыстая рука не дакранецца да Божай Скарбніцы, і хай вусны верных несьціхана славяць Багародзіцу анельскім прывітаньнем, радасна ўсклікаючы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

Зачаўшы — вышэй за ўсякае разуменьне — Бога, Ты, Дзева, была вызваленая ад закону прыроды. Будучы прыродна тленнаю, ты падчас родаў не зазнала звычайных мацярынскіх боляў. Дзеля гэтага Ты ўдастоілася пачуць прывітаньне: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

Як гэта Ты, Чыстая Дзева, корміш малаком? Людзкі язык бясьсільны выказаць тайну Твайго сынараджэньня, бо яно пераўзыходзіць законы прыроды. Дзеля гэтага ты ўдастоілася пачуць прывітаньне: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

У пісаньнях цьмяна гаворыцца пра Цябе, Маці Ўсявышняга. Якуб, убачыўшы некалі лесьвіцу, што была Тваім правобразам, сказаў: "Вось брама нябесная". Таму Ты ўдастоілася пачуць: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

Вогненны куст быў цудоўным знакам для Майсея сьвятасузіральніка. У пошуку значэньня бачанага ў поўні часу, ён сказаў: "Бачу спаўненьне яго ў Дзеве чыстай, якой як Багародзіцы будзе сказана: Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

Даніла бачыў Цябе як духоўную гару, Ісая — як Божую Маці; Гедэон — як руна; Давід назваў Цябе сьвятыняю, а іншы прарок — брамаю. А Габрыель усклікнуў Табе: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

***Экзапастылар.*** Начальнік анельскіх хораў быў пасланы ад Усемагутнага Бога да Усячыстай Дзевы абвясьціць Ёй дзіўны і невыказны цуд, што Бог народзіцца ад Яе як дзіця і станецца чалавекам, каб адрадзіць род людзкі. Дык абвяшчайце, людзі, абнаўленьне сьвету. (*Двойчы*)

Слава... цяпер...

Спрадвечная тайна Божая сёньня робіцца яўнаю. У міласэрнасьці сваёй Бог-Слова стаецца Сынам Дзевы Марыі. І Габрыель абвяшчае радасную Добрую вестку. Разам з ім усклікнем: "Радуйся, Маці Божая!"

**Пахвальныя псалмы**

*(Тон 1).* З нябесных прастораў зьляцеў Габрыель у Назарэт і, стаўшы перад Дзевай Марыяй, сказаў Ёй: "Радуйся! Ты зачнеш Сына, які быў раней за Адама, Творцу вякоў і Вызваліцеля тых, што славяць Цябе, клічучы: Радуйся, Усячыстая!" *(Двойчы)*

Спрадвечнае Слова спрадвечнага Айца, не адлучыўшыся ад неба, дзеля вялікай спагадлівасьці сваёй сёньня зьявілася на зямлі і, зьмілаваўшыся над нашай немаччу, успрыняла неўласьцівую Яму Адамаву ўбогасьць.

Габрыель прынёс Дзеве добрую вестку, кажучы: "Радуйся! Бо Ты зачнеш Неўмяшчальнага, які зьмесьціцца ва ўлоньні Тваім; і народзіш Таго, хто раней ад заранкі зазьзяў ад Айца.

Слава... цяпер...

*(Тон 2).* Спрадвечная тайна сёньня робіцца яўнаю. Сёньня Сын Божы стаецца Сынам чалавечым, каб, успрыняўшы горшае, даць нам лепшае. Адам некалі даў сябе падмануць: жадаў стаць Богам і не стаў ім. І вось Бог стаецца чалавекам, каб Адама абагавіць. Хай цешыцца стварэньне! Хай радуецца прырода, бо вось арханёл стаіць са страхам перад Дзеваю і прыносіць Ёй радасьць, несумяшчальную са смуткам. Божа наш, што ў велічы міласэрнасьці сваёй стаўся чалавекам, слава Табе!

***Вялікае ўсхваленьне і заканчэньне ютрані сьвяточнай.***

# ЛІТУРГІЯ
## у дзень сьвята

*Ва ўсе дні тыдня Вялікага посту, апрача суботы і нядзелі, а таксама ў тры першыя дні Вялікага Тыдня Сьвятая літургія ў дзень Дабравешчаньня служыцца вечарам у спалучэньні з вячэрняй.*

*У суботу і нядзелю служыцца Літургія (Сьв. Яна Залатавуснага або Базыля Вялікага) ў звычайным часе.*

*У Бізантыйскім абрадзе сьвята Дабравешчаньня ніколі не пераносіцца на іншы дзень, нават калі яно выпадае ў Чысты Чацьвер, Вялікую Пятніцу і Суботу і на Вялікдзень (у гэтым апошнім выпадку такое падвойнае сьвята завецца "Кірыяпасха"). Парадак служэньня ў гэтыя дні гл. у тыпіконе.*

### 1. ВЯЧЭРНЯ З ЛІТУРГІЯЙ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 4).* У шосты месяц быў пасланы арханёл да Чыстае Дзевы і, кажучы Ёй радавацца, абвясьціў, што ад Яе мае нарадзіцца Збавіцель. Прыняўшы прывітаньне, зачала Яна спрадвечнага Бога, які ў невыказны спосаб захацеў стацца чалавекам для збаўленьня душ нашых.

Незразумелымі здаліся Багародзіцы словы арханёла, калі той аб'явіў Ёй радасную вестку. Прыняўшы прывітаньне, Яна зачала Цябе, Бога спрадвечнага. Дзеля гэтага мы радасна ўсклікаем Табе: "Божа, што прыняў цела, застаўшыся тым, чым заўсёды быў, даруй сьвету Твайму супакой і душам нашым багацьце зьмілаваньня Твайго".

Вось Абяцаны сёньня аб'явіўся нам: вышэй за разуменьне, Бог злучаецца з родам людзкім, і голас арханёла адганяе спакусу. Дзева прымае радасьць, зямное стаецца небесным, і сьвет вызваляецца ад першаснага праклёну. Хай цешыцца ўсё стварэньне і хай пяе моцным голасам: "Творча і Збавіцелю наш, слава Табе!"

*(Тон 1).* Габрыель, вялікі дух, што Бога бачыць тварам у твар, прамяністы і збавенны, узіраецца на Трохсонечнае Сьвятло і разам з усімі нябеснымі сіламі пяе дзіўную песьню хвалы Богу, і моліць Яго даравать душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня.

Вялікая тайна, анёлам раней няведамая і перад вякамі ўтоеная, табе, Габрыелю, адзінаму была давераная. І ты, прыйшоўшы ў Назарэт, абвясьціў яе адзінай Чыстай. Разам з Ёю маліся Богу, каб Ён дараваў душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня .

Поўны сьвятла, ты, Габрыелю слаўны, анёлаў начальніча, чыніш волю і выконваеш загады Ўсемагутнага. Збаўляй тых, што з любоўю шануюць цябе, і прасі няспынна Бога дараваць душам нашым супакой і багацьце зьмілаваньня.

Слава ...цяпер...

(*Тон 6*). Арханёл Габрыель быў пасланы з неба абвясьціць Дзеве радасную вестку Ейнага зачацьця. Прыйшоўшы ў Назарэт, ён падумаў у сабе, дзівячыся цуду: "Як гэта здарылася, што Той, каго нябёсы зьмясьціць ня могуць, родзіцца ад Дзевы;Той, хто мае за пасад неба і зямлю за падножак для ног сваіх, у дзявочым улоньні зьмяшчаецца; Той, на якога шасьцікрылыя сэрафімы і шматвокія хэрувімы зірнуць ня сьмеюць, словам адным ад Дзевы цела прыняць захацеў, сам будучы Божым Словам? Дык чаго ж я стаю і не кажу Дзеве: «Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою; радуйся, Чыстая Дзева, Нявеста беззаганная; Радуйся, Маці Жыцьця! Блаславёны плод улоньня Твайго".

*Уваход з евангельлем. Пракімен дня.*

**Чытаньне кнігі Выхаду** (*3: 1-8*)

Калі Майсей пасьвіў авечкі цесьця свайго Етра, сьвятара мадыянскага, ён завёў аднаго разу іх далёка ў пустыню і прыйшоў да гары Божай Гарэб. Тады зьявіўся яму анёл Гасподні ў полымі агню сярод куста. Майсей бачыў, як палаў агнём куст, але не згараў. Сказаў тады Майсей: "Падыду бліжэй, каб лепш пабачыць гэтае дзівоснае зьявішча, чаму не згарае куст". Госпад Бог, убачыўшы, што Майсей падыходзіць бліжэй, каб лепш бачыць, клікнуў моцным голасам : "Майсей, Майсей!" Той адказаў: "Вось я". Сказаў тады яму (Госпад): "Не прыбліжайся больш! Здымі абутак з ног тваіх, бо месца, на якім стаіш — зямля сьвятая". І яшчэ сказаў Госпад: "Я — Бог айца твайго, Бог Абрагама, Бог Ісаака, і Бог Якуба". І Майсей затуліў твар свой, бо баяўся глянуць на Бога. Госпад казаў: "Досыць Я наглядзеўся на цярпеньні людзей Маіх у Ягіпце і наслухаўся іхніх нараканьняў на сваіх прыгнятальнікаў. Я ведаю добра іхні боль. Дзеля гэтага Я і зышоў, каб выратаваць іх з рук егіпцянаў і вывесьці з тэй зямлі ў зямлю пладавітую, прасторную, у зямлю, дзе плыве малако і мёд".

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*8:22-30*)

Бог меў мяне (мудрасьць) на пачатку шляху, перад тым, як пачаў тварыць, здавён-даўна. Спрадвеку я была ўстаноўленая, перш чым паўстала зямля. Я народжаная раней за бездань і за крыніцы вадаточныя; раней, як былі заснаваныя горы, раней за ўзгоркі было маё нараджэньне, — калі Ён не стварыў яшчэ ні

зямлі, ні палёў, ані найдрабнейшых пылінак зямных. Я з Ім была, калі Ён умацоўваў неба; калі вымяраў скляпеньне над безданьню; калі згушчаў хмары ўгары, калі ўстанаўляў крыніцы ў бездані; вызначаў межы мору, каб ягоныя воды ня выступілі з берагоў; калі закладаў асновы зямлі, — я была спадарожніцаю Ягонай і ўцехаю з дня ў дзень, цешачыся перад абліччам Ягоным увесь час.

*Малая літанія "Яшчэ і яшчэ...", з воклікам:*

Бо Ты сьвяты, Божа наш, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі**: Амін. Сьвяты Божа ...і г. д.

*Далей Літургія Сьвятога Яна Залатавуснага па парадку.*

***Пракімен** (Пс 95:2,1).* Абвяшчайце з дня на дзень збаўленьне Бога нашага.
*Верш.* Сьпявайце Госпаду песьню новую; сьпявай Госпаду, уся зямля.

**Чытаньне лісту сьвятога апостала Паўла да Гэбрэяў** ( *2:11-18*)

Браты, той, хто асьвячае, і тыя, што асьвячаюцца, — усе ад аднаго. Дзеля гэтага Ён не саромеецца называць іх братамі, кажучы: "Абвяшчу імя Тваё братом Маім, пасярод царквы буду хваліць Цябе". І яшчэ: "Буду спадзявацца на Яго". І яшчэ: "Вось Я і дзеці Мае, якіх даў Мне Бог". Пакольні ж дзеці ўдзельнічаюць у крыві і целе, дык і Ён стаўся іхнім удзельнікам, каб праз сьмерць перамагчы таго, хто меў уладу над сьмерцю, гэта значыць д'ябла, і каб вызваліць усіх тых, каго страх сьмерці праз усё жыцьцё трымаў у няволі. Бо сапраўды, Ён не анёлам прыходзіць на дапамогу, але патомкам Абрагама. Дзеля гэтага трэба было стацца Яму падобным ва ўсім да братоў, каб быць міласэрным і верным першасьвятаром перад Богам, для ачышчэньня грахоў людзей. Таму, што сам цярпеў і выпрабоўваўся, Ён можа прыйсці з дапамогаю тым, што церпяць выпрабаваньні.

***Алілуя** (Пс 71:6,17).* Зыйдзе, як дождж на траву, як лівень, што арашае зямлю.
*Верш.* Імя Яго будзе блаславёнае давеку: пакуль сонца сьвеціць, трываць будзе імя Яго.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Лукі** (*1:24-38*)

У той час Альжбета, жонка Захара, зачала і таілася пяць месяцаў, кажучы: "Так учыніў мне Госпад, глянуўшы на мяне ласкава і зьняўшы маю ганьбу перад людзьмі".

У шосты ж месяц быў пасланы ад Бога анёл Габрыель у места галілейскае званае Назарэт да Дзевы, заручанай з мужам з дому Давідавага, імя якога было Язэп. Імя ж Дзевы было Марыя. І, увайшоўшы да Яе, анёл сказаў: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою! Блаславёная Ты між жанчынаў". Яна ж, калі пачула яго, сумелася ад ягоных слоў і задумалася, што б магло значыць гэтае прывітаньне. Але анёл сказаў Ёй: "Ня бойся, Марыя, бо Ты знайшла ласку ў Бога. Вось зачнеш і народзіш сына, якому дасі імя Ісус. Ён будзе вялікі і будзе называцца Сынам Найвышэйшага, а Госпад Бог дасьць Яму пасад ягонага прабацькі, Давіда. Ён будзе панаваць над домам Якуба давеку, і Ягонаму панаваньню ня будзе канца". Марыя ж сказала анёлу: "Як гэта станецца, калі я мужа ня знаю?" Адказаў на гэта анёл: "Дух Сьвяты зыдзе на Цябе, і сіла Ўсявышняга ахіне Цябе. Таму і Сьвятое, што народзіцца, будзе звацца Сынам Божым. Вось і Твая сваячка, Альжбета, зачала ў старасьці сына, і ўжо шосты месяц той, якую называюць няплоднаю. Бо ў Бога няма нічога немагчымага". І сказала Марыя: "Вось я, слуга Гасподняя: хай мне станецца згодна з тваім словам". І анёл адышоў ад Яе.

***Задастойнік:*** Абвяшчай, зямля, радасьць вялікую; нябёсы, хваліце Божую славу.

Хай ніякая нячыстая рука не дакранецца да Божай скарбніцы, і хай вусны верных несьціхана славяць Багародзіцу анельскім прывітаньнем, радасна ўсклікаючы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою!"

***Прычасьнік** (Пс 131:13).* Госпад выбраў сабе Сыён, захацеў зрабіць сабе жыльлё ў ім. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 2. ЛІТУРГІЯ Ў СУБОТУ І НЯДЗЕЛЮ

***Трапар** (Тон 4).* Сёньня пачатак нашага збаўленьня і спрадвечнай тайны аб'яўленьне: Сын Божы Сынам Дзевы стаецца і Габрыель ласку абвяшчае. Дзеля гэтага і мы разам з ім усклікнем Багародзіцы: "Радуйся, Поўная ласкі, Госпад з Табою".

***Кандак** (тон 8).* Магутная Ўладарка Багародзіца, мы, верныя слугі Твае, выбаўленыя Табою ад бедаў, песьні ўдзячнасьці і перамогі Табе прыносім. Ты ж, маючы сілу неператожную, ад усякіх напасьцяў выратуй нас, каб нам усклікнуць Табе: "Радуйся, Дзева Маці!"

***Пракімен, Апостал і г. д:** глядзі вышэй.*